ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

I КВАРТАЛ

Віцебск 2018

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

I квартал

2018

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2018

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар Н. У. Ціпанава
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : I квартал 2018 года : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2018. – 47 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2018

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

I квартал

2018

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

баяністаў і акардэаністаў далучыліся цымбалісты і спевакі, якія таксама прадэманстравалі сваё выканаўчае майстэрства.

У Баравухскай ДШМ № 3 Полацкага раёна ў канцы **сакавіка** адбыўся I адкрыты гарадскі конкурс ансамблевай музыкі «Вясновая фантазія», у якім прынялі ўдзел больш за 40 музычных калектываў з Віцебска, Наваполацка, Полацка, Оршы, Барані і інш.

ХАРЭАГРАФІЯ

20–21 студзеня ў Канцэртнай зале «Віцебск» адбыўся XXXIII Міжнародны конкурс па спартыўных бальных танцах «Віцебская сняжынка-2018». Звыш 500 пар з 24 краін свету (7 узроставых груп) спаборнічалі ў 29 намінацыях. У адкрытым абласным турніры, які праходзіў паралельна з міжнародным, прынялі ўдзел танцавальныя дуэты з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Літвы і Латвіі.

КІНАМАСТАЦТВА

6 лютага ў віцебскім Доме кіно было праведзена святочнае мерапрыемства з нагоды 120-годдзя першага кінапаказу (першага сеанса сінематографа) у Віцебску.

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 студзеня па 31 сакавіка 2018 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Дзявятым у летапісе рэспубліканскай акцыі **«Культурная сталіца Рэспублікі Беларусь»** стаў Наваполацк. **23 студзеня** на перадачу сертыфіката аб прысваенні гэтага статусу завіталі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў і старшыня Бабруйскага выканкама Аляксандр Студнеў. У Наваполацкім музычным каледжы прадстаўнічую дэлегацыю віталі лепшыя творчыя калектывы ўстановы. У Цэнтры культуры была разгорнута выстава-прэзентацыя «Скарбонка творчасці», на якой былі прадстаўлены дасягненні ўстаноў культуры горада. Апафеозам стала ўрачыстая перадача сертыфіката і сімвала культурнай сталіцы – крыштальнага жураўля. Завяршыла мерапрыемства канцэртная праграма з удзелам лепшых калектываў і выканаўцаў Наваполацка, гасцей з Бабруйска, эстрадных спевакоў Максіма Сапацькова, Ганны Благавай, Іны Афанасьевай. Урачыстыя мерапрыемствы далі старт вялікаму творчаму праекту «Лілея сяброўства», які будзе рэалізоўвацца ў Наваполацку на працягу 2018 года.

2 лютага ў канцэртнай зале «Віцебск» адбыўся ўрачысты сход і святочны канцэрт, прысвечаныя 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці і ўшанаванню лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» за 2017 год. У намінацыі «Сацыяльная сфера» гэтага высокага звання ўдастоены дырэктар УА «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў» **Ірына Станіславаўна Абдулаева**, педагог дадатковай

удзельнічалі харавыя і інструментальныя калектывы і выканаўцы з Беларусі і Расіі, адбыліся ў залах музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага, духоўнай семінарыі і Свята-Успенскага кафедральнага сабора. Звыш 500 удзельнікаў аб’яднаў **7 студзеня** вялікі святочны канцэрт на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа. Архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый уручыў граматы калектывам са Светлагорска, Ніжняга Ноўгарада, Екацярынбурга і Віцебскаму народнаму маладзёжнаму хору. Епархіяльнымі медалямі Віцебскай епархіі «Святой Владимир исповедник Витебский» 1-й і 2-й ступені былі ўзнагароджаны мастацкі кіраўнік і дырыжор свята **Віталь Рауза** і кіраўнік народнага маладзёжнага хору **Аляксандр Рауза**.

13 студзеня Віцебская абласная філармонія запрасіла на святочную праграму «Новогодний каледоскоп: от классики до джаза», якую падрыхтавалі актэт балалаек «Віцебскія віртуозы» пад кіраўніцтвам Тамары Шафранавай і саліст Леанід Кажарскі.

19 лютага канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора споўнілася 35 гадоў. Штогод тут праводзяцца каля 300 канцэртаў арганнай і камернай музыкі.

16–17 сакавіка ў Наваполацкім музычным каледжы прайшоў конкурс фартэпіяннай музыкі «Натхненне», у якім удзельнічалі больш за 80 навучэнцаў наваполацкіх, полацкіх і рэгіянальных школ мастацтваў.

Актэт балалаек «Віцебскія віртуозы» Віцебскай абласной філармоніі прыняў удзел у першым міжнародным фестывалі «Петербург балалайки», які праходзіў **20–25 сакавіка** ў Санкт-Пецярбургу і быў прымеркаваны да 130-годдзя прафесійнай канцэртнай балалайкі. Калектыў пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі Беларусі Тамары Шафранавай выступіў разам з музыкантамі з 11 краін свету.

Традыцыйны фестываль баяннай і акардэоннай музыкі «Баян-фэст» у трэці раз прайшоў напрыканцы **сакавіка** ў Браславе і сабраў юных музыкантаў і іх педагогаў з Браслаўшчыны, Міёр і Наваполацка. Сёлета да

у Расійскай Федэрацыі (г. Масква). Паказ аповяда пра Максіма Багдановіча быў прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы.

Народны драматычны калектыў «Вандроўнікі» прадпрыемства «Элект» ГА «БелТіЗ» пад кіраўніцтвам актрысы тэатра імя Я. Коласа Раісы Грыбовіч ажыццявіў пастаноўку казкі братоў Грым «Брэменскія музыкі». Прэм'ера мюзікла, у якім занятыя і невідушчыя артысты-аматары, прайшла з поспехам.

26 сакавіка ў круглай зале КЗ «Віцебск» Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, Беларускі тэатр «Лялька» і народны тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанкі прынялі ўдзел у сумесным праекце «Дзень тэатра». У межах тэмы «Казкі для дарослых» супрацоўнікі абласной бібліятэкі прадставілі кніжную выставу «Усё пачынаецца і заканчваецца казкамі».

27 сакавіка ў тэатры імя Я. Коласа адбылося адкрыццё мастацка-дакументальнага праекта «Маё жыццё ў мастацтве», прысвечанага жыццю і творчасці народнай артысткі Беларусі Святланы Акружной.

Маладая актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа **Анастасія Рэўчанка** ўзнагароджана прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная кветка», які прысуджаецца за ўдалы дэбют. Шэраг узнагарод атрымалі прадстаўнікі Беларускага тэатра «Лялька». Нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» ўзнагароджана вядучы майстар сцэны **Вольга Лазебная**. Граматы Міністэрства культуры атрымалі артысты **Наталля Гайдук**, **Валерый Зімніцкі** і рэжысёр-пастаноўшчык **Міхась Клімчук**. Падзяка міністра культуры ўручана артыстцы **Марыне Марозавай**. (*Витьбичи. – 2018. – 29 марта. – С. 1–3.*)

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

Свята духоўнай музыкі праведзена ў Віцебску. З 1993 года яно традыцыйна праходзіць на праваслаўнае Ражство. Канцэрты, у якіх

адукацыі ДУ «Расонскі цэнтр дзяцей і моладзі» **Алена Мікалаеўна Вашчанка**, краязнаўца **Аркадзь Міхайлавіч Падліпскі**.

13 (26) лютага споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння былога першага сакратара ЦК Кампартыі БССР, Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы, ураджэнца Сенненшчыны **Пятра Міронавіча Машэрава**. У гэты дзень у Расонах была ўрачыста адкрыта Алея Славы. Памятны архітэктурны комплекс з 7 гранітных пліт пачынаецца памятным знакам П. М. Машэраву. Урачыстасці прадоўжыліся ў Музеі баявой садружнасці, дзе адкрылася тэматычная фотавыстава «Машэраў на Расоншчыне» і пачала работу навукова-практычная канферэнцыя «Расонскі край: гісторыя, культура, людзі». У абласным цэнтры да бюста выдатнага дзяржаўнага дзеяча Беларусі былі ўскладзены кветкі прадстаўнікамі ўлады і грамадскіх арганізацый. У ВДУ імя П. М. Машэрава адбыліся ўрачысты сход і святочны канцэрт. У Машканскім Доме культуры Сенненскага раёна прайшла юбілейная ўрачыстасць, на якой успаміны пра знакамітага земляка чаргаваліся з творчымі выступленнямі калектываў раённага Цэнтра культуры, Машканскага ДК, Багушэўскай і Машканскай дзіцячых школ мастацтваў. «Сын зямлі беларускай» – пад такой назвай у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі экспанавалася фотадакументальная выстава. У экспазіцыі – 10 самастойных тэматычных блокаў, якія прадстаўляюць нашага знакамітага земляка ў розныя перыяды жыцця і дзейнасці.

19 лютага ў Віцебску адбылося пасяджэнне Камісіі Парламенцкага Сходу па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. Удзельнічалі прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, Камітэта па культуры Дзяржаўнай Думы Расіі, пастаянных камісій Палаты Прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, міністэрстваў культуры і міністэрстваў адукацыі Беларусі і Расіі, Віцебскага аблвыканкама, кіраўнікі абласных устаноў культуры. Пасяджэнне было прысвечана пытанням пашырэння супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў галіне культуры. Былі абмеркаваны

задачы далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы на 2018–2022 гады і фарміравання агульнай культурна-інфармацыйнай прасторы. (*Витьбичи. – 2018. – 20 февр. –С. 3. ; Витебские вести. – 2018. – 22 февр. – С. 2.*)

23 лютага Прыдзвінскі край разам з усёй краінай адзначыў 100-годдзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Святочныя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх раёнах вобласці. Прадстаўнікі ўлады і грамадскасці наведалі помнікі і месцы масавага пахавання загінуўшых воінаў, у культурна-асветных установах былі арганізаваны юбілейныя канцэрты. Ля манумента савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам на плошчы Перамогі Віцебска адбыліся ўрачысты мітынг і ўскладанне вянкоў і кветак. У канцэртнай зале «Віцебск» прайшоў урачысты сход, на якім ветэранам былі ўручаны юбілейныя медалі «100 год Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь». Затым адбыўся вялікі канцэрт, падрыхтаваны выхаванцамі Віцебскага кадэцкага вучылішча, ваеннаслужачымі 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады, лепшымі творчымі калектывамі і выканаўцамі горада.

28 лютага ў Палацы культуры Полацка адбылося выязное пасяджэнне калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама з удзелам начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Ільясевіча, намесніка міністра культуры Ірыны Дрыгі. З асноўным дакладам на выніковай калегіі выступіў начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Генадзь Ягораў. Па традыцыі ў рамках калегіі адбылася цырымонія ўзнагароджання лепшых устаноў культуры і мастацтва вобласці прэміямі Віцебскага аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва ў 2017 годзе. Лепшымі ў сваіх намінацыях сталі **Аршанская дзіцячая школа мастацтваў № 1**, **Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка**, **Цэнтр культуры горада Наваполацка**, **Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці**, **Лёзненскі Дом рамёстваў**, **Міёрская дзіцячая бібліятэка**, **Бігосаўскі сельскі Дом**

Дом рамёстваў такім чынам распавядае пра сваю легенду ці паданне. У рамках правядзення выстаў прайшлі майстар-класы.

У сакавіку ўдзельніцы аб'яднання аматараў вышыўкі «Иголочка», якое дзейнічае пры Культурна-гістарычным комплексе «Золотое кольца Віцебска «Дзвіна», прадставілі сваю творчасць у Віцебскім мастацкім музеі. У экспазіцыі – 65 карцін вядомых мастакоў, вышытых 13 аўтарамі.

У Глыбоцкім Доме рамёстваў **у сакавіку** адкрылася выстава «Калейдаскоп рамёстваў», якую прывезлі майстры Докшыцкага Дома рамёстваў.

ФОТАМАСТАЦТВА

На працягу **студзеня** ў выставачнай зале Музея гісторыі і культуры Наваполацка экспанавалася фотавыстава «Святло Віфлеемскай зоркі». Аўтар – палачанка Святлана Марозава.

У Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі **ў студзені** адкрылася фотавыстава Васіля Разанава «Мы».

У Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна **ў студзені** падведзены вынікі ўжо традыцыйнай для гэтай установы выставы-конкурсу фотаздымкаў замежных студэнтаў ВДАВМ і ВДУ імя П. М. Машэрава – удзельнікаў клуба інтэрнацыянальнага сяброўства «Згода».

У лютым у Полацкім прыродна-экалагічным музеі адкрылася выстава «В царстве зимы». Полацкія фатографы Ала і Аляксандр Эрдман прадставілі ў сваіх работах насельнікаў лясоў Беларускага Паазер'я.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

31 студзеня на сцэне коласаўскага тэатра была прадстаўлена опера «Viva la mamma» Г. Даніцэці ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

19 лютага коласаўцы паказалі спектакль «Калісь глядзеў на сонца я…» у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь

З **13 лютага па 2 сакавіка** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працавала абласная выстава-конкурс "Сонцазварот", прысвечаная народнаму святу "Масленіца". Дамы і Цэнтры рамёстваў з 14 раёнаў вобласці прадставілі сваё ўвасабленне Масленіцы. У экспазіцыі: абрадавыя лялькі, маскі, абярэгі, вышыўка, кераміка і інш. Таксама адкрылася выстава «Полацку прысвячаецца», у якой прынялі ўдзел народныя клубы «Майстар», «Рошва» Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, народнага клуба самадзейных мастакоў «Белае палатно» і ўзорнай выяўленчай студыі Полацкага гарадскога Палаца культуры.

У сакавіку свае вырабы на выставе ў АМЦНТ прадставілі майстры Оршы і Наваполацка. У экспазіцыі Аршанскага Дома рамёстваў ўражвае пано «Оршы – 950!», выкананае ў тэхніцы лапікавага шыцця, а таксама работы са скуры па творах У. Караткевіча. Клуб «Прамень» Наваполацкага Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры прапанаваў аплікацыю саломкай, кераміку, валянне, вязанне кручком і іншыя экспанаты.

27 сакавіка ў выставачнай зале АМЦНТ адкрыліся для прагляду дзве абласныя выставы. Абласная выстава-конкурс майстроў ткацтва і пляцення паясоў і абярэгаў «Паясы не толькі для красы» дэманструе багатыя традыцыі гэтага рамяства на Віцебшчыне. На выставе прадстаўлены разнастайныя творы ткацтва і пляцення паясоў, а таксама габелены, тэкстыльная пластыка, сувенірная вытворчасць і дызайнерскія рэчы аб'ёмна-прасторавага характару, кампазіцыі на разнастайныя фальклорныя і казачныя тэмы. У экспазіцыі – абярэгі з дрэва, гліны, саломкі і іншых прыродных матэрыялаў. Побач з мастацкімі творамі – метадычная і рэкламная друкарская прадукцыя па мясцовых адметнасцях ткацтва і пляцення паясоў, творчасці вядомых майстроў. Лепшыя матэрыялы будуць распаўсюджаны па ўстановах культуры вобласці. Абласная выстава «Легенды і паданні Прыдзвінскага краю» прадстаўлена праз творы, выкананыя ў розных тэхніках дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Кожны

культуры Верхнядзвінскага раёна, **Друеўская бібліятэка Браслаўскага раёна**. (*Витебские вести. – 2018. – 3 марта. – С. 3. ; Витьбичи. – 2018. – 3 марта. – С. 10.*)

У лютым старшыня Глыбоцкага райвыканкама А. Морхат правёў сустрэчу з работнікамі культуры раёна, на якой азначыў важную ролю ўстаноў культуры і мастацтва ў жыцці Глыбоччыны. Удзельнікам народнага клуба майстроў «Крыніца» Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці былі ўручаны Падзякі старшыні райвыканкама за ўклад у зберажэнне тэхналогій народных рамёстваў.

У лютым адзначалася 75-годдзе Асвейскай трагедыі. Ля Кургана Бессмяротнасці, дзе захоўваецца попел спаленых фашыстамі вёсак Асвейшчыны, адбыўся мітынг-рэквіем. У Асвейскім Доме культуры быў праведзены літаратурна-музычны вечар «Мы будзем помніць праз вякі», падрыхтаваны работнікамі Верхнядзвінскай ЦБС, Асвейскай бібліятэкі і музычнай школы.

Генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск», дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» **Аляксандр Сідарэнка** ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Як адзначана ва Указе Прэзідэнта Беларусі, дзеяч культуры Віцебшчыны адзначаны за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў і выдатныя дасягненні.

У сакавіку праходзілі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 75-годдзя Хатынскай трагедыі. Былі арганізаваны мітынгі-рэквіемы ля помнікаў спаленым вёскам Віцебшчыны, ускладзены вянкі, кветкі. У Віцебскім дзяржаўным музычным каледжы імя І. І. Салярцінскага адбыўся канцэрт «Есть память, которой не будет забвения», у Віцебскай ЦГБ імя М. Горкага прайшоў тэматычны вечар «Свеча памяти». У музеі гісторыі і культуры г. Оршы адкрылася выстава «Хатынь. Уроки памяти». У Гарадоцкім ГДК адбыўся вечар-рэквіем «Звон Хатыні». У Расонскім музеі баявой садружнасці была прадстаўлена гісторыка-літаратурная кампазіцыя «Вогненны летапіс памяці».

Выніковыя нарады аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў Віцебскай вобласці прааналізавалі дзейнасць сферы культуры за 2017 год і вызначылі накірункі работы ў 2018 годзе. Лепшыя работнікі культуры, установы і творчыя калектывы былі ўзнагароджаны па выніках дзейнасці ў мінулым годзе.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У студзені дэлегацыя Дубровеншчыны пабывала ў латвійскім горадзе Дагда на падвядзенні вынікаў года сярод устаноў культуры Дагдскага краю. Дырэктар ДУК «Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага раёна» Уладзімір Бабічаў, салісты народнага ВІА «AURUM» Уладзімір Хацееў і Аксана Анікеева выступілі з канцэртнай праграмай перад жыхарамі Дагды – горада-пабраціма Дуброўна.

Народны тэатр Лёзненскага РЦК «У пошуку…» пад кіраўніцтвам Генадзя Цыганкова наведаў гарадскі Дом культуры ў Рудні Смаленскай вобласці, дзе прадставіў гледачам камедыю-фарс «Палата бизнес-класса» рускага сцэнарыста А. Кароўкіна. (*Сяг перамогі. – 2018. – 6 лют. – С. 5.*)

У пачатку сакавіка прадстаўнікі Наваполацкага гарвыканкама пабывалі з візітам у латвійскім горадзе-пабраціме Лудза. На сустрэчы з кіраўніцтвам Лудзенскага краявога самакіравання абмяркоўваліся механізмы рэалізацыі творчага праекта «Лілея сяброўства», які стартаваў у Наваполацку у рамках святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 60-годдзю горада, і рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца Рэспублікі Беларусь-2018». Для жыхароў Лудзы сапраўдным падарункам стаў канцэрт творчых калектываў Наваполацка – тэатра песні «Субботея» і кавер-групы Mohito.

13 сакавіка ў рамках Пагаднення аб дружбе і добрасуседстве з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі дэлегацыя Нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Смаленшчыны пабывала ў г. п. Лёзна. Госці

24 лютага ў Лёзненскім раённым Доме рамёстваў адкрылася выстава мясцовага самадзейнага мастака Віктара Яршова пад назвай «Пишу о том, что дорого…».

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З **23 студзеня па 9 лютага** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працавала выстава "Кола года" народных клубаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў "Дубрава" Дубровенскага Дома рамёстваў і "Талака" Шаркаўшчынскага Дома рамёстваў.

У Глыбоцкім цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці **ў студзені** адкрылася выстава народнага клуба лапікавага шыцця «Рошва» Полацкага цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур. Полацкія рукадзельніцы прывезлі ў Глыбокае свой творчы праект «Грани».

У Чашніцкім раённым Доме рамёстваў **у студзені** працавала выстава «Зімовая казка». У экспазіцыі: навагоднія цацкі ручной работы з традыцыйных матэрыялаў, дэкаратыўныя елкі, работы вядомага майстра глінянай цацкі Святланы Арэхавай. **У лютым** экспанаваліся выставы членаў народнага клуба майстроў народных мастацкіх рамёстваў «Майстар»: экспазіцыя «Мастацтва гліны і агню» майстра па кераміцы Алены Рыжанковай і аўтарская выстава «Палитра моей души» мастака, майстра разьбы па дрэве Валерыя Карабліна.

«Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны» – назва новага навукова-папулярнага выдання, выдадзенага галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама і Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці. Складальнікі – вядучыя метадысты АМЦНТ Ніна Бабровіч і Людміла Вакар. Прэзентацыя кнігі адбылася **9 лютага.**

10 лютага Браслаўскі музей традыцыйнай культуры запрасіў наведвальнікаў на адкрыццё выставы вырабаў з лазы «Ад хваінкі да лазінкі» аўтарства Веры Маліня з г. Даўгаўпілса і яе вучняў.

экспанавалася выстава смаленскіх мастакоў Валерыя Ляшэнкі і Ніны Ігнаценкавай. Выстава «Поэзия цвета» прапанавала ў лютым знаёмства з творчасцю 19 аўтараў народнага творчага клуба аршанскіх мастакоў «Рэнесанс».

Адзін са старэйшых віцебскіх мастакоў Уладзімір Вітко адкрыў **у лютым** маштабную выставу «Вітко. 85» напярэдадні свайго юбілею. Яна экспанавалася ў Віцебскім мастацкім музеі. Тут жа экспанавалася і персанальная выстава «Традиции и современность» смаленскай мастачкі Людмілы Панамаровай.

У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстава «Нямецкая акупацыя ў графіцы Меера Аксельрода», прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту.

На працягу **лютага** ў Мастацкай галерэі Полацка экспанавалася выстава тэкстылю «Невядомыя людзі». Аўтар – мастачка Дыяна Янушонэ з г. Рыгі.

У зале Віцебскага Цэнтра сучаснага мастацтва **ў лютым** экспанавалася выстава «Месяц Ай». У экспазіцыі – 60 работ віцебскага мастака Алега Прусава (1970–1996).

21 лютага ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстава «Гісторыя аднаго мястэчка» (па выніках 29-га пленэру, праведзенага культурна-асветніцкім цэнтрам імя Язэпа Драздовіча ў жніўні 2017 г. у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна). У экспазіцыі – 35 мастацкіх твораў 16 аўтараў з Віцебска, Верхнядзвінска, Лепеля, Полацка, Наваполацка, Гомеля, Мінска і саміх Лужкоў.

23 лютага ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі адбылося адкрыццё 9-га Міжнароднага выставачнага праекта «Коллегиум». Арганізатары – УК «Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны», мастацкая галерэя В. А. Грамыкі, ГА «Беларускі саюз мастакоў», Смаленскае аддзяленне «Саюза мастакоў Расіі». У экспазіцыі звыш 80 работ аўтараў з Беларусі, Расіі, Балгарыі, Арменіі і Малдовы.

пазнаёміліся з дзейнасцю культурна-аздараўленчага цэнтра, абмеркавалі пытанні далейшага супрацоўніцтва ў розных галінах эканомікі і сацыяльнай сферы, у тым ліку – правядзенне сумесных культурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, накіраваных на грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне.

У сакавіку Віцебск наведала дэлегацыя з Любліна. Польскія госці выказалі зацікаўленасць у развіцці супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, культуры і навукі. Дырэктар Цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва К. Станоўскі перадаў начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Н. Шыянок спіс прапаноў па культурным супрацоўніцтве. У выніку візіту быў падпісаны пратакол аб намерах. (*Витьбичи. – 2018. – 17 марта. – С. 2.)*

У сакавіку г. Верхнядзвінск наведала дэлегацыя Дагдскай краявой Думы Латвіі з мэтай пашырэння культурнага супрацоўніцтва. У Верхнядзвінскай ЦРБ адкрылася выстава майстра Дзіяны Кісялёвай з Дагды пад назвай «Арнамент і бісер». Госці з Латвіі правялі майстар-класы па розных накірунках дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Мерапрыемства наведала дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталля Гуйвік, якая выказала падзяку латвійскім гасцям за творчае супрацоўніцтва. (*Дзвінская праўда. – 2018. – 23 сак. – С. 4.*)

30 сакавіка дэлегацыя Дубровенскага раёна з афіцыйным візітам наведала г. п. Красный Смаленскай вобласці і прыняла ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. У Краснінскім раённым Доме культуры адбыўся канцэрт «Две страны – одна судьба» з удзелам творчых калектываў Дубровенскага і Краснінскага раёнаў. У фае РДК працавалі фотавыстава «Мы дружбою сильны», выстава-продаж вырабаў майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці Дубровенскага Дома рамёстваў, праходзілі майстар-класы.

Харэаграфічныя калектывы Альгоўскага СДК Віцебскага раёна прынялі ўдзел у VIII Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцячай і юнацкай

творчасці «Славянский хоровод», які праходзіў **напрыканцы сакавіка** ў Смаленску. У намінацыі «Харэаграфія» калектыў «Ольговские непоседы» ўдастоены Дыплома I ступені, узорны калектыў «ОльКира» атрымаў Дыплом II ступені.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

З вясёлымі песнямі і цікавымі культурнымі праграмамі сустракалі жыхары Віцебска **Каляды**. На плошчы Перамогі абласнога цэнтра была арганізавана спартыўна-гульнёвая праграма «Віцебскія Каляды». У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кольца горада Віцебска «Дзвіна» прайшло свята народнага календара «Віцебскія Каляды, або Каляды ў Задзвінні». У Палацы культуры мікрараёна Руба калядная акцыя сабрала шматдзетныя і малазабяспечаныя сем'і. У Расонскім раённым Доме культуры і народнай творчасці адбыўся калядны канцэрт «Рождество Христово – символ добра и любви» з удзелам калектываў і салістаў установы культуры, які дапоўніла выстава творчых работ навучэнцаў студыі «Каларыт» Расонскай дзіцячай школы мастацтваў. З нацыянальнай кухняй, аркестрам і батлейкай адзначылі свята Раства ў Сенненскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці. З гэтай культурнай праграмай удзельнікі каляднага канцэрта «Святло Раства» выступілі і на сцэне Багушэўскага гарпасялковага Дома культуры. Вакальна-харэаграфічны калектыў «Ярыца» Верхнядзвінскага РДК падрыхтаваў тэатралізаванае дзейства для дзяцей і дарослых, з якім пазнаёміў жыхароў райцэнтра і в. Гейжанава. Раённае свята «Калядны фэст» было праведзена ў аграгарадку Сваташыцы Дубровенскага раёна ў трэці раз. Народны гурт архаічных спеваў «Княжыч» Наваполацкага Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры 6 студзеня наведаў жыхароў г. п. Баравуха. Калядоўшчыкі ладзілі забавы, гульні, спявалі калядныя песні. Традыцыйную калядную вечарыну «Ехала Каляда з Полацку…»

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці была прысвечана выстава «Віцебшчына ў творах мастакоў». Экспазіцыя, якая адкрылася ў пачатку **студзеня** ў Мастацкім музеі, аб'яднала 54 жывапісныя і графічныя работы звыш 40 аўтараў. 80-гадоваму летапісу вобласці прысвяцілі маштабны выставачны праект музейныя работнікі вобласці. У абласным краязнаўчым музеі ўпершыню экспанаваліся экспанаты з музеяў 21 раёна вобласці і фондавых калекцый ВАКМ (разам звыш 500 экспанатаў). Музейна-педагагічныя заняткі «Віцебскі і Суражскі раёны на карце Віцебскай вобласці ў 1938 годзе» падрыхтавалі для школьнікаў работнікі Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

У Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстава «Мастер ксилографии», на якой прадстаўлены творы выкладчыка Віцебскага мастацкага тэхнікума Яфіма Мініна (1894–1937) з фондаў ВАКМ. (*Витьбичи. – 2018. – 25 янв. – С. V.*)

Да **31 студзеня** ў Віцебскім мастацкім музеі экспанавалася выстава графікі «Пад знакам Скарыны» сучасных беларускіх мастакоў. У экспазіцыі 79 твораў.

30 студзеня ў зале Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці адбылася ўрачыстасць з нагоды 20-годдзя адкрыцця экспазіцыі Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея. Супрацоўнікі музея падрыхтавалі пазнавальную экскурсію ў мінулае ўстановы і расказ пра сённяшнюю дзейнасць музейных работнікаў, прапанавалі прагляд фільма Віцебскага абласнога тэлебачання, знятага з нагоды адкрыцця ўстановы, і прэзентацыю «Знакамітыя землякі». (*Веснік Глыбоччыны. – 2018. – 3 лют. – С. 8.*)

25-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Індыяй была прысвечана выстава беларускіх мастакоў «IND-БЕЛ-ART», якая адкрылася **ў студзені** ў Аршанскай мастацкай галерэі В. Грамыкі з удзелам Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Саксены Панкаджа. **У лютым** у галерэі

Напярэдадні свята Нараджэння Хрыстова ў Асвейскай дзіцячай школе мастацтваў Верхнядзвінскага раёна з мэтай адраджэння духоўных традыцый у 10-ы раз быў праведзены музычны фестываль «Рождественская звезда».

10 лютага пяцёра навучэнцаў Расонскай ДШМ прымалі ўдзел у V Міжраённым конкурсе дзіцячай выканаўчай творчасці «Волшебные звуки музыки» ў Себежы Пскоўскай вобласці. Цымбалістка Дар'я Аўласенка атрымала Дыплом лаўрэата I ступені, астатнія юныя музыканты – Дыпломы III ступені.

Зводны ансамбль барабаншчыц Віцебскай вобласці ў колькасці 400 чалавек прыняты ў Сусветную арганізацыю мажарэт-спорту MWF, у якую ўваходзяць 15 краін свету. Першым ад Беларусі ўступіў у яе Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці.

Чарговы абласны семінар-практыкум кіраўнікоў ансамбляў мажарэтак і барабаншчыц па пытаннях падрыхтоўкі да II фестывалю-конкурсу сярод мажарэтак і барабаншчыц у рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску-2018» адбыўся ў Віцебскім АМЦНТ **22 сакавіка**. Прайшлі майстар-класы, якія правялі Яўген Ткачонак, выкладчык па класе ўдарных інструментаў Полацкай ДШМ, і Наталля Несцерава, мастацкі кіраўнік узорнага калектыву мажарэтак «Залатыя пагоны» ГДК імя Леніна г. Вялікія Лукі, рэгіянальны прадстаўнік ФБТМ у Пскоўскай вобласці, член судзейскай калегіі Міжрэгіянальнай грамадскай арганізацыі па спорце «Федэрацыя Батон Твірлінга і мажарэтак Расійскай Федэрацыі». Пасля заканчэння семінара ўдзельніцам былі выдадзены сертыфікаты.

Народны ансамбль беларускай песні «Маладзіца» выкладчыкаў Навасёлкаўскага філіяла Варапаеўскай ДШМ Пастаўскага раёна ўзнагароджаны Дыпломам I ступені II Міжнароднага конкурсу-фестывалю вакальнага і харэаграфічнага майстэрства «Славянскія самацветы», які праходзіў **25–28 сакавіка** ў Мінску.

арганізавалі работнікі полацкага Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я і фальклорны гурт «Варган» Полацкага дзяржуніверсітэта. 12 студзеня на сцэне Полацкага гарадскога Палаца культуры прайшлі «Калядныя сустрэчы», у рамках якіх адбыўся фінал II адкрытага раённага конкурсу праваслаўнай літаратурна-музычнай творчасці «Благовест над Полоцком». Уладальнікам Гран-пры конкурсу стала група «Прайм-тайм» Цэнтра сучаснага мастацтва «Джэм» Полацкага гарадскога Палаца культуры (кіраўнік Максім Міхайлаў). 13 студзеня вёска Багатырская Полацкага раёна ўжо другі год запар стала цэнтрам свята «Колядный разгуляй». Яно сабрала прадстаўнікоў устаноў культуры Полаччыны, мясцовых жыхароў і гасцей.

У Чашніцкім ГДК **у студзені** адбылося мерапрыемства да 80-годдзя ўтварэння Віцебскай вобласці. Дом рамёстваў прадаставіў аўтэнтычныя побытавыя касцюмы, цэнтральная бібліятэка – кнігі аб гісторыі і выдатных людзях краю, раённы гістарычны музей – экспанаты, якія захаваліся з 1940-х гадоў. Самадзейныя калектывы горада і раёна прадэманстравалі сваё майстэрства ў святочным канцэрце.

16 студзеня стартавала міжнародная акцыя «Читаем Григорьева вместе», прымеркаваная да дня памяці рускага паэта і перакладчыка Ігара Мікалаевіча Грыгор'ева (1923–1996), творчасць якога аб'яднала Беларусь, Пскоўшчыну і Санкт-Пецярбург. Ушаноўвалі паэта і ў Гарадку, дзе ён жыў звыш 10 гадоў, пісаў вершы і рабіў пераклады твораў беларускіх паэтаў. У КАЦ «Гарадок» прайшла вечарына памяці «Люблю тебя светло» з удзелам паэтэсы Наталлі Саветнай, клубных і бібліятэчных работнікаў. Да акцыі далучыліся многія бібліятэкі раёна.

У канферэнц-зале полацкага Музея беларускага кнігадрукавання адбылася прэзентацыя кнігі рэдактара народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» Галіны Загурскай «У месяцовым перламутры». Гучалі вершы ў выкананні аўтара і сяброў-наддзвінцаў, выконваліся песні на вершы паэтэсы, выступалі творчыя калектывы гарадскога Палаца культуры.

У студзені сваё 80-годдзе адзначыў самадзейны кампазітар Эдуард Літвін з Лепеля. У яго творчым актыве каля трохсот песень, асноўны лейтматыў якіх – родны край і яго людзі. У зале РДК юбіляра віншавалі калегі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі і раённага кіраўніцтва. Гучалі песні ў выкананні хору ветэранаў, жаночага хору Бярэзінскага запаведніка «Беразіначка» і самога кампазітара.

19 студзеня кінаканцэртная зала «Іскра « ў Докшыцах запрасіла жадаючых на гарадскі баль «Чароўны менуэт». У праграме: выступленні 10 танцавальных пар, вакальныя нумары артыстаў ГЦК, гульні, узнагароджанне пераможцаў раённай выставы-конкурсу «Карнавальная маска-2018».

Традыцыйныя творчыя віншаванні да Міжнароднага дня жанчын былі падрыхтаваны многімі ўстановамі культуры і мастацтва вобласці. **7 сакавіка** ў канцэртнай зале «Віцебск» адбыўся святочны канцэрт з удзелам калектываў і выканаўцаў Цэнтра культуры «Віцебск», музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага і каледжа культуры і мастацтваў, Полацка, Наваполацка, Расон і Докшыц, артыстаў тэатра імя Я Коласа і Беларускага тэатра «Лялька».

КЛУБНАЯ СПРАВА

Работнікі сельскіх устаноў культуры на чале з Полацкім раённым Цэнтрам культуры арганізавалі «Навагодні турыстычны маршрут па Полацкім раёне». Палатоўскі СДК правёў навагоднюю сустрэчу «З мінулага ў будучыню. Прыгоды Дзеда Палататкі». Творчая каманда Багатырскага СДК падрыхтавала спартыўна-забаўляльнае свята «Мороз-Богатырь», у якім удзельнічалі мясцовыя жыхары і ваеннаслужачыя вайсковых часцей 55719 і 25888. Гомельскі СДК сумесна з народным клубам армянскай кухні «Хаш» арганізаваў гістарычную сустрэчу двух Дзядоў Маразоў – беларускага і армянскага. Сільніцкі СДК пераўтварыўся ў старадаўні маёнтак пана Лісоўскага, дзе быў наладжаны «Навагодні

Міжнароднага дня роднай мовы, яна прысвечана беларускім пісьменнікам, паэтам, навукоўцам, чые юбілеі прыходзяцца на 2018 год.

21–22 лютага адбылася справаздачная канферэнцыя па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў 2017 годзе. У ходзе канферэнцыі прагучала 30 дакладаў, тэматыка якіх ахоплівала разнастайны спектр пытанняў музейнай справы, археалогіі, гісторыі і культуры Полацка і Полаччыны. Для ўдзельнікаў канферэнцыі была праведзена прэзентацыя «Гравёрнай майстэрні», якая пачала дзейнічаць у Мастацкай галерэі.

Супрацоўнікі Браслаўскага раённага аб’яднання музеяў падрыхтавалі выставу фарфору і фаянсу з фондаў установы, якая экспанавалася **ў лютым** у гісторыка-краязнаўчым музеі.

На працягу **лютага** ў выставачнай зале Ушацкага музея народнай славы імя У. Е. Лабанка экспанаваліся жывапісныя творы самадзейнага мастака Дзям’яна Крупені і выстава ваеннай амуніцыі, знакаў і ўзнагарод, прысвечаная 100-годдзю Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Полацкі музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я ўдастоены гранта ў межах міжнародных праектаў трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія–Літва–Беларусь. Падтрымку атрымаў праект «Вывучэнне і захаванне традыцый рамесных навыкаў жыхароў даліны ракі Дзвіна–Даўгава і перадача іх будучым пакаленням».

У музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка **ў сакавіку** адкрылася выстава мадэляў сярэднявечнага ўзбраення «Броні і зброя». Экспанаты прадастаўлены клубам гістарычнай рэканструкцыі «Полацкі звяз».

МАСТАЦТВА

10 студзеня ў ДШМ № 3 «Маладзік» г. Віцебска адкрылася традыцыйная калядная конкурсная выстава «Рождественские мотивы». Дзеці з 25 устаноў адукацыі і нядзельных школ вобласці прадставілі 310 чароўных сюжэтаў, створаных дзіцячай фантазіяй.

рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). (*Веснік Глыбоччыны. – 2018. – 17 студз. – С 2.*)

Старшыня Глыбоцкага райвыканкама Алег Морхат правёў выязное пасяджэнне з актывам раёна з мэтай адраджэння «Альгердава шляху» (адной з самых старых дарог у Беларусі) і старога млына ў в. Зябкі. Работы па добраўпарадкаванні дарогі і кансервацыі млына будуць садзейнічаць занясенню гэтых аб'ектаў у Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

25 студзеня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Кракаўскія калядныя батлейкі», падрыхтаваная Гістарычным музеем горада Кракава і Польскім інстытутам у Мінску. У адкрыцці выставы прынялі ўдзел пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Конрад Паўлік, прадстаўнікі Гістарычнага музея горада Кракава і Польскага інстытута ў Мінску.

З 25 студзеня ў Міёрскім гісторыка-этнаграфічным музеі пачала дзейнічаць выстава «Наш родны край», прысвечаная 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці.

6–27 лютага ў Полацкім краязнаўчым музеі экспанавалася выстава «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны».

9 лютага ў гістарычным асабняку па вуліцы Марка Шагала, 5а г. Віцебска ўрачыста адкрыўся новы музей – Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. (ВНМВ размяшчалася ў гэтым будынку ў 1919–1923 гадах). Для ўдзельнікаў цырымоніі дырэктарам Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва Андрэем Духоўнікавым і доктарам мастацтвазнаўства Таццянай Катовіч былі праведзены экскурсіі.

9–28 лютага ў Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі экспанавалася выстава «Іх абпальвала полымем вайна», прысвечаная Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і 100-годдзю Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

17 лютага ў Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання распачала працу выстава «Служэнне роднаму слову». Традыцыйна прымеркаваная да

прыём». У Захарніцкім СДК дзяцей і дарослых гасцінна сустракаў Захар Снегавік.

У Падсвільскім СДК Глыбоцкага раёна было праведзена мерапрыемства «Запрашаем на Калядныя вячоркі», якое арганізавала аматарскае аб'яднанне «Спадчына». Сапраўдным упрыгожаннем сустрэчы фізкультурна-аздараўленчай групы «Эдэльвейс» і ансамбля песні «Весялушкі» стала выступленне 85-гадовай баяністкі і спявачкі Таісіі Флар'янаўны Дударонак з в. Кішы.

10 студзеня ў Наваполацкім Цэнтры культуры прайшоў традыцыйны калядны канцэрт. Праграма парадавала прысутных прыгажосцю інструментальных і вакальных твораў, харэаграфічных нумароў. Была арганізавана выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці, выяўленчага мастацтва ўстаноў культуры і адукацыі горада, Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання.

14 студзеня на базе Ёдскага СДК Шаркаўшчынскага раёна адбылася фальклорная вечарына, прымеркаваная да святкавання старога Новага года. На сустрэчу сабраліся ўсе фальклорныя калектывы раёна. Спявалі, танцавалі, ладзілі гульні, вадзілі карагоды, «жанілі Цярэшку».

Напярэдадні Старога Новага года культработнікі і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Яноўскага СДК Сенненскага раёна падрыхтавалі народна-побытавую інсцэніроўку, дзе паказалі, як святкавалі Каляды нашы продкі. У абрадавых гульнях і танцах удзельнічалі ўсе прысутныя.

У Наваполацкім цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры прайшла творчая імпрэза, якая дала старт мерапрыемствам пад знакам «Наваполацк – культурная сталіца-2018». Народны тэатр лялек «Капялюш» прадставіў прэм'еру спектакля «Свет у базарны дзень (Адзін дзень з жыцця Полацкага базару)» – пастаноўку на аснове інтэрмедый традыцыйнай беларускай батлейкі. Была праведзена тэатралізаваная вечарына, якая праз гульні і танцы пазнаёміла гледачоў з народнай культурай рэгіёна.

«Табе, Прыдзвінне, прысвячаем!» – пад такой назвай у Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна распачалася арт-акцыя, прысвечаная

80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці. Старт мерапрыемству дала персанальная выстава твораў выкладчыка Віцебскага індустрыяльна-педагагічнага каледжа, кіраўніка гуртка дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Чароўны куфэрак» Мазалаўскага СДК Вольгі Ганчаровай.

У Полацкім раёне стартаваў сумесны праект раённага Цэнтра культуры і рэгіянальнай тэлекампаніі «Скіф» па адраджэнні традыцый аўтэнтычнай мясцовай кухні. Першай гераіняй кулінарнага падарожжа ў мінулае пад назвай «Полаччына гасцінная» стала 78-гадовая жыхарка в. Багатырская М. М. Ракіцкая. Узнавіць атмасферу мінулых часоў дапамог народны фальклорны калектыў «Галасы спадчыны» Багатырскага СДК.

Глыбоцкі цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці сумесна з раённым саветам ветэранаў арганізаваў сустрэчу з рукадзельніцамі Глыбоччыны пад назвай «Тепло ваших рук…». Майстры народнага клуба «Крыніца» афармілі выставу, творчую атмасферу падтрымлівалі ўдзельніцы ансамбля «Весялушкі» Падсвільскага Дома культуры і іншыя выканаўцы.

Новы крэатыўны праект «Цешчыны зборы па-палатоўску» паспяхова рэалізаваны ў аг. Палата Полацкага раёна. Мерапрыемства, арганізаванае па ініцыятыве Полацкага раённага Цэнтра культуры пры садзейнічанні творчых супрацоўнікаў Палатоўскага і Захарніцкага СДК, Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур, з удзелам народнага вакальнага ансамбля «Бела чайка» Азінскага СДК, пакінула добрыя ўражанні ў шматлікіх гледачоў.

У Цэнтры культуры «Полацк» напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны быў арганізаваны афіцэрскі баль.

23 сакавіка ў Дубровенскім РДК адбыўся юбілейны канцэрт заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага ансамбля песні і музыкі «Крыніца», прысвечаны 25-годдзю дзейнасці самадзейнага калектыву.

22 сакавіка тэатралізаваным прадстаўленнем «Свята дома, дзе жывуць кнігі» дзіцячая бібліятэка адзначыла свой 55-гадовы юбілей. Гасцямі свята сталі юныя чытачы трэціх класаў СШ № 1 райцэнтра.

У Лужкаўскай бібліятэцы была арганізавана сустрэча з беларускім пісьменнікам Віктарам Праўдзіным пад назвай «Аптыміст з берагоў Мнюты».

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

5 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы прайшла пазнавальная гадзіна «Нынче вся земля светла и звонят колокола».

28 студзеня ў чытальнай зале ЦРБ народная літаратурна-музычная гасцёўня «Крыніца» правяла тэматычную сустрэчу «Беларускія народныя святы і звычаі».

2 лютага ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі была праведзена гутарка з элементамі гучнага чытання «Лесной хозяин» (да 145-годдзя з дня нараджэння М. Прышвіна).

25 лютага ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў вечар памяці П. М. Машэрава.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

«Цуд навагодняй цацкі» – выстава пад такой назвай экспанавалася ў Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі.

У пачатку студзеня ў Талачынскім гісторыка-краязнаўчым музеі прайшло фінальнае мерапрыемства па рэалізацыі мясцовай ініцыятывы «Экалагічная інтэрактыўная музейная прастора «Чалавек у прыродзе».

У студзені ў Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі была ўрачыста адкрыта зала віртуальных падарожжаў. Гэта адбылося дзякуючы рэалізацыі ініцыятывы «Віртуальныя падарожжы па гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна» ў рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Дзень памяці «Беларусы памятаюць Машэрава» быў арганізаваны **ў лютым** ва ўсіх бібліятэках сістэмы (выставы, тэматычныя паліцы, інфармацыйныя гадзіны і г. д.).

1 сакавіка ў Новалукомльскай гарадской бібліятэцы прайшла акцыя да Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам, у рамках якой праведзена гадзіна прававой інфармацыі «Наркотыкі і крымінальная адказнасць».

23 сакавіка споўнілася 70 год з дня нараджэння паэта, перакладчыка, публіцыста Генадзя Пашкова – ураджэнца Чашніччыны. З нагоды юбілею ў ЦРБ была афармлена кніжная выстава «Імя ў гісторыі нашага краю», праведзены віртуальны агляд літаратуры «Жывое слова пісьменніка», арганізаваны творчы вечар «Толькі б мне спявалася аб родным».

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

9 студзеня ў Верацееўскай бібліятэцы адбылася краязнаўчая гадзіна «Дарогамі жыцця Лазара з Лужкоў», прымеркаваная да 160-годдзя з дня нараджэння Лазара Перэльмана (Эліэзера Бэн-Іегуды), якога называюць «бацькам» сучаснага іўрыту.

26 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы была праведзена мультымедыйная праграма для школьнікаў пад назвай «Жыві, квітней, мой родны край!» (да 80-годдзя Віцебскай вобласці).

Бібліятэкар Радзюкоўскай бібліятэкі разам з юнымі чытачамі арганізавала флэш-моб «Скажи о Родине ты добрые слова», у час якога адбылося распаўсюджванне буклетаў аб Віцебскай вобласці.

У Лужкаўскай сельскай бібліятэцы да Дня роднай мовы была наладжана літаратурна-музычная вечарына «Мова бацькоў – мудрасць вякоў» з удзелам членаў аб'яднання «Світанак».

24 сакавіка ў Палацы культуры г. Барані адбыўся святочны канцэрт з нагоды 30-гадовага юбілею народнага ансамбля народнай музыкі і песні «Крынічанька».

28 сакавіка ў Багушэўскім Доме культуры адбылася прэм'ера спектакля «Аз і Ферт» паводле вадэвіля рускага драматурга Паўла Фадзеева ў пастаноўцы мясцовага народнага тэатра (кіраўнік Юрый Іваноўскі).

30 сакавіка ў Цэнтры культуры «Полацк» прайшоў юбілейны канцэрт «Нашы песні – наша жыццё» народнага ансамбля беларускай песні «Нявіда» Фарынаўскага Цэнтра культуры і вольнага часу, прысвечаны 25-годдзю творчага калектыву.

У сакавіку народны гарадскі тэатр Аршанскага цэнтра культуры «Победа» ажыццявіў прэм'еру спектакля «Язычники» па п'есе Ганны Яблонскай. Рэжысёр-пастаноўшчык Васіль Мігаль.

«Песні малой радзімы» – пад такой назвай прайшоў юбілейны канцэрт ансамбля народнай песні «Сваякі» Дома культуры аг. Дабрамыслі Лёзненскага раёна. Творчы калектыў быў створаны ў сакавіку 1998 года і за 20 гадоў існавання парадаваў сваімі выступленнямі не толькі жыхароў раёна, вобласці, рэспублікі, але і набыў прыхільнікаў у суседняй Смаленскай вобласці.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

3 студзеня на сцэне Міёрскага раённага Дома культуры адбыўся 16-ы фестываль каляднай песні «Зорка Бэтлеема». Удзельнікаў вітаў біскуп Віцебскай дыяцэзіі Алег Буткевіч.

Аматараў народных спеваў і музыкі, побытавых танцаў і нацыянальнай кухні сабраў **2 лютага** Віцебскі раённы цэнтр культуры і творчасці ў аграгарадку Тулава на раённы фальклорны фэст «Жывая спадчына». У мерапрыемстве прынялі ўдзел дзіцячыя і дарослыя фальклорныя калектывы, індывідуальныя выканаўцы, якія прыехалі не толькі з устаноў культуры Віцебска і Віцебскага раёна, але і з

Аршаншчыны, Лёзненшчыны, Дубровеншчыны, Полацка, Магілёўскай вобласці і нават Масквы. (*Витьбичи. – 2018. – 8 февр. – С. IV.*)

У Лёзненскім раёне Год малой радзімы стартаваў фестывалем песні «Добровидение» ў Доме культуры аг. Дабрамыслі. Мэта мерапрыемства працягласцю ў чатыры туры (люты – чэрвень) – павышэнне культурнага ўзроўню жыцця на сяле, паляпшэнне культурнага абслугоўвання жыхароў раёна.

16 і 21 лютага ў Талачыне і Докшыцах прайшлі адборачныя туры абласнога конкурсу патрыятычнай песні "Песні юнацтва нашых бацькоў", а таксама абласны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні для адбору кандыдатаў для ўдзелу ў Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2018". **14 сакавіка** ў Аршанскім Доме культуры чыгуначнікаў адбыўся фінальны тур , прысвечаны 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці, у якім удзельнічалі 18 салістаў і 8 ансамбляў.

XII абласны агляд-конкурс фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Ад прашчураў да зор» **2 сакавіка** сабраў у Расонскім цэнтры культуры і народнай творчасці каля 370 удзельнікаў, якія спаборнічалі ў конкурсе музычных інструментальных ансамбляў традыцыйнага складу, аглядзе дзіцяча-моладзевых фальклорных калектываў і ў турніры пар – выканаўцаў народных бытавых танцаў, а таксама ў конкурсе-выставе дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Гран-пры быў прысуджаны мясцоваму ўзорнаму фальклорнаму калектыву «Нежачкі» пад кіраўніцтвам Алены Вашчанкі, які будзе прадстаўляць Віцебшчыну на рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня». (*Голас Расоншчыны. – 2018. – 10 сак. – С. 3.*)

2–10 сакавіка ў Оршы праходзіў фестываль праваслаўнай культуры «Кладезь». У ГЦК «Победа» працавала выстава-кірмаш вырабаў ручной работы насельніц Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра (г. Мінск). Для дзяцей праходзілі выступленні лялечнага тэатра

сінявокая», праводзіліся інфармацыйныя гадзіны «Віцебскай вобласці – 80 гадоў». У ЦРБ была зроблена выстава-экспазіцыя «Летапіс Віцебскай вобласці» і прайшоў Дзень інфармацыі «Знакамітыя мясціны Віцебшчыны».

2 лютага ў ЦРБ была арганізавана сустрэча з аспірантам Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандрам Бараноўскім, які прэзентаваў свае кнігі «Яны нарадзіліся на Сенненшчыне» і «Звязаныя лёсам з Сенненшчынай».

15 сакавіка ў бібліятэках сістэмы былі афармлены выставы і праведзены інфармацыйныя гадзіны прававых ведаў «Конституция – символ эпохи», «Закон для всех и каждого», «Конституция и мы» і інш.

21 сакавіка ў ЦРБ адбылося адкрыццё цыкла мерапрыемстваў, прысвечаных Году малой радзімы. У віртуальнае падарожжа па г. Сянно «Такой древний, такой молодой» былі запрошаны ўдзельнікі клуба «Залаты ўзрост» і чытачы бібліятэкі.

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У студзені ў Сарочынскай бібліятэцы была праведзена конкурсна-забаўляльная праграма «Сказки Перро не стареют», у Глыбачанскай бібліятэцы – гадзіна карысных парад «Что нужно знать о витаминах».

У лютым у дзіцячай бібліятэцы быў праведзены турнір знаўцаў да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь пад назвай «Держава армией крепка». Гадзіна беларусазнаўства «Падарожжа ў родную мову» да Міжнароднага дня роднай мовы прайшла ў Вялікадолецкай бібліятэцы.

У сакавіку ў Глыбачанскай бібліятэцы да Сусветнага дня вады была арганізавана пазнавальна-забаўляльная праграма «Чудесный мир воды», у Селішчанскай бібліятэцы праведзена прафілактычнае мерапрыемства да Дня барацьбы з наркаманіяй «У палоне залежнасці».

айцом Георгіем – святаром Богаяўленскага сабора. **29 студзеня** ў бібліятэцы прайшло мерапрыемства «За вясёлкай наўздагон», прымеркаванае да 75-годдзя беларускага пісьменніка Міколы Чарняўскага.

15 лютага ў бібліятэцы-філіяле № 5 прайшла літаратурная вечарына «Строки, опаленные афганской войной», **26 лютага** – інфармацыйная гадзіна «Зямляк. Партызан. Палітык» (да 100-гадовага юбілею П. Машэрава).

27 лютага ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылося літаратурнае знаёмства з паэтам, пісьменнікам, журналістам Навумам Гальпяровічам пад назвай «Востраў душы».

У ЦРБ імя Ф. Скарыны прайшоў «круглы стол» на тэму «Сучасны стан беларускай літаратуры: актуальныя пытанні і перспектывы». Удзельнічалі сябры народных літаратурных аб'яднанняў «Наддзвінне», «Полоцкая ветвь», «Литературный ковчег» і работнікі Полацкай РЦБС. (*Полацкі веснік. –2018. – 2 сак. – С. 6.*)

На базе ЦРБ імя Ф. Скарыны адкрылася літаратурная студыя «Цэнтр Еўропы». Для больш чым 90 паэтаў і пісьменнікаў рэгіёна яна стане месцам правядзення дыскусій, прэзентацый, творчых сустрэч з чытачамі. (*Витебские вести. – 2018. – 20 марта. – С. 6.*)

9 сакавіка ў бібліятэцы-філіяле № 5 адбылася вечарына паэзіі пад назвай «Я каханне душою слухаю…». На сустрэчу з удзельнікамі клуба «Цеплыня сэрцаў» завіталі полацкія паэты Мікалай Балдоўскі, Галіна Загурская, Любоў Міхайлава і Ірына Еўдакімовіч.

27–30 сакавіка ў бібліятэцы імя А. Герцэна прайшоў Тыдзень дзіцячай кнігі. У праграме: гістарычны экскурс «Цуд, імя якому кніга», літаратурны каламбур «Падарожжа ў кніжнае царства», літаратурная гульня «Кніга – акно ў свет».

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Бібліятэкі сістэмы **ў студзені** адзначылі 80-годдзе ўтварэння Віцебскай вобласці. Былі афармлены кніжныя выставы «Віцебшчына мая

«Батлейка». У бібліятэцы імя А. Пушкіна аршанцы сустрэліся з мінскай пісьменніцай Таццянай Дашкевіч.

У сакавіку праходзілі занальныя туры абласнога этапу XIV Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны», якія адбыліся ў Міёрскім РДК, культурна-дзелавым цэнтры «Першамайскі» абласнога цэнтра і Гарадоцкім ГДК.

22–25 сакавіка ў Аршанскім ГЦК «Победа» прайшоў V Міжнародны фестываль-конкурс сучаснага мастацтва і крэатыўнай творчасці «Апельсиновая береза». Удзельнічалі таленавітыя дзеці з розных гарадоў Беларусі і г. Дзеснагорска Смаленскай вобласці.

Міжнародны фестываль-конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні «Две сестры – Беларусь и Россия» сабраў **28–30 сакавіка** ў Віцебску звыш 100 удзельнікаў – прадстаўнікоў Віцебска, Віцебскай і Смаленскай абласцей.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

У студзені ў аддзеле літаратуры па мастацтве пачала работу «Школа рукоделия». Сакрэтамі вышыўкі і вязання з усімі жадаючымі дзеляцца майстры клуба «Чароўная нітка» ДУ «Цэнтр культуры «Віцебск» Галіна Хіневіч і Тамара Сіманава.

8 студзеня адбылося адкрыццё персанальнай выставы жывапісу члена Беларускага саюза мастакоў Барыса Лалыкі «Трывалая повязь».

10 студзеня ў бібліятэцы прайшло пасяджэнне метадычнага аб'яднання школьных бібліятэкараў Першамайскага раёна г. Віцебска на тэму «Арганізацыя працы з бібліятэчнымі фондамі ў адпаведнасці з абноўленымі ўліковымі формамі».

15 студзеня была праведзена літаратурна-музычная вечарына «Альманаху «Двіна: Віцебшчына літаратурная – 60!» з цыкла мерапрыемстваў, прымеркаваных да 80-годдзя ўтварэння Віцебскай

вобласці. Прысутных павіншаваў са значнай датай у гісторыі вобласці начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў. Вехі гісторыі Віцебшчыны прагучалі ў выступленні старшыні Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамары Красновай-Гусачэнкі. Свае вершы прачыталі паэты Галіна Загурская, Ірына Радзіхоўская, Пётр Буганаў, Алена Крыклівец, Алена Фядзяева, Уладзімір Папковіч, Тамара Краснова-Гусачэнка. Вечарына была аздоблена цудоўным выступленнем народнага ансамбля музычных інструментаў «Кантраст».

25 студзеня прайшлі чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма – «Віцебск як адміністрацыйны цэнтр (ад княства да вобласці)». Галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Дзяніс Юрчак правёў экскурс у мінулае Віцебшчыны ад Віцебскага княства, Віцебскай губерні да Віцебскай вобласці. Аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Бараноўскі спыніўся на рэгіёнах, якія ў розны час уваходзілі ў склад іншых абласцей Беларусі.

31 студзеня ў сектары ПЦПІ адбылося арганізацыйнае пасяджэнне дзіцячага клуба «Правознайка».

6 лютага ў рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» быў арганізаваны майстар-клас па бісерапляценні «Бліскучы свет». Яго правяла інвалід па зроку III групы, валанцёр Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання несельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска Марына Папова.

7 лютага адбылася літаратурна-музычная вечарына «Урокі мужнасці», прысвечаная 100-годдзю арміі Беларусі. Мерапрыемства, падрыхтаванае супрацоўнікамі бібліятэкі сумесна з Віцебскай гарадской і абласной арганізацыямі ветэранаў вайны ў Афганістане, сабрала ветэранаў вайны і ўзброеных сіл, былых малалетніх вязняў канцлагераў, ваеннаслужачых, кадэтаў, студэнцкую моладзь.

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Да 80-годдзя ўтварэння Віцебскай вобласці праведзены: этнаграфічныя замалёўкі «Віцебшчына старажытная» (дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі), інфармацыйная гадзіна «Віцебшчына – галубая жамчужына Беларусі» (ЦРБ), краязнаўчы ўрок «Знаешь ли ты Витебскую область?» (Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка).

14 студзеня ў ЦРБ прайшло мерапрыемства – літаратурны партрэт «Каб магла я зоркаю гарэць» (да 125-годдзя з дня нараджэння Канстанцыі Буйла).

14 лютага ў ЦРБ адбылася духоўная гутарка «Мост в семь вёрст. Великий пост» з удзелам выкладчыка нядзельняй школы царквы Святога Мікалая ў Паставах Ірыны Калесень.

12 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі да Дня праваслаўнай кнігі адбылося духоўнае падарожжа «Моя первая Священная история». Удзельнікі пазнаёміліся з галоўнай кнігай усіх вернікаў «Бібліяй».

28 сакавіка аддзелам бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ быў праведзены конкурс прафесійнага майстэрства сярод маладых бібліятэчных работнікаў. З 5 удзельніц журы вызначыла пераможцу – бібліятэкара адддела абслугоўвання цэнтральнай бібліятэкі Анастасію Бурцаву.

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У бібліятэцы імя Я. Купалы **5 студзеня** ў рамках творчага плана «З крыніц спрадвечных» была праведзена фальклорная гадзіна «Ехала Каляда ў чырвоным вазочку…», **29 студзеня** быў арганізаваны майстар-клас «Дзіцячая кніжка сваімі рукамі» ў рамках творчага плана «Яе Вялікасць Кніга».

Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога **10 студзеня** правяла гадзіну духоўнасці «Каляды – гэта свята цудаў», у час якой школьнікі сустрэліся з

У літаратурнай кафейні **26 студзеня** адбылася сустрэча з мясцовай паэтэсай і мастаком Тамарай Седневай і прэм'ера яе кнігі «Без фальши», **27 студзеня** прайшоў вечар памяці У Высоцкага «Честная песня поэта».

13 лютага ў ЦРБ для вучняў СШ № 1 г. п. Лёзна была праведзена літаратурна-краязнаўчая сустрэча «Усё жыццё – служэнне народу», прысвечаная 100-гадоваму юбілею Пятра Міронавіча Машэрава.

Да Міжнароднага дня роднай мовы ў дзіцячым аддзеле ЦРБ па традыцыі праходзіла акцыя «Сёння мы размаўляем па-беларуску».

27 лютага ў ЦРБ былі праведзены першыя раённыя «Сретенские чтения» на тэму «Роля бібліятэкі ў духоўна-маральнай адукацыі і выхаванні» з удзелам бібліятэкараў, краязнаўцаў, музейных работнікаў, духавенства.

20 сакавіка ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў традыцыйны Дзень праваслаўнай кнігі.

31 сакавіка ў літаратурнай кавярні «Пад абажурам» адбыўся вечар жаночай лірыкі мясцовай паэтэсы Яўгеніі Саламацінай «В моих мечтах, и снах, и наяву…». Увазе чытачоў быў прапанаваны новы зборнік яе вершаў «Мечты о Париже».

ДУК «Міёрская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

18 студзеня ў раённай бібліятэцы адбылася сустрэча з вядомым беларускім пісьменнікам, ураджэнцам Міёршчыны Францам Сіўко. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава «У голасе з родным адценнем».

23 студзеня ў ЦРБ стартаваў цыкл мерапрыемстваў «Наш край, пачуй прызнанне ў любові: 80-годдзю Віцебскай вобласці прысвячаецца». На мерапрыемства былі запрошаны вучні 10 класа СШ № 2 райцэнтра.

8 лютага ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма – «Штодзённае жыццё віцяблян у 1920-я гады». Лектарамі выступілі загадчык кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П. М. Машэрава Анатоль Дулаў і вядучы архівіст Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці Святлана Мясаедава.

15 лютага адбылося адкрыццё першай персанальнай выставы батыка «Вянок жыцця са слоў і фарбаў» старшыні Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў, журналісткі Анастасіі Пятроўны Лазебнай. Працягам імпрэзы стала творчая вечарына Стасі Наркевіч (Настассі Лазебнай) і прэзентацыя яе новай кнігі для дзяцей «Неверагодныя здарэнні на неверагоднай планеце».

19 лютага ў бібліятэцы прайшоў вечар пытанняў і адказаў «Злачынства і пакаранне» з удзелам прадстаўнікоў упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці і протаіерэя Сергія Захарава, члена Віцебскага епархіяльнага суда.

21 лютага адбылася традыцыйная літаратурна-музычная імпрэза да Міжнароднага дня роднай мовы і была праведзена агульная дыктоўка.

22 лютага прайшлі чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада». Тэма – «Культурнае жыццё віцяблян у 1920-я гады». Лектарамі выступілі вядучы архівіст Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці Святлана Мясаедава і галоўны захавальнік фондаў ДУ «Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей» Сяргей Марціновіч.

27 лютага ў рамках цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы» адбылася сустрэча з кіраўніком Віцебскага рэгіянальнага цэнтра героіка-патрыятычнага выхавання «ПОШУК» (на базе ўстановы культуры «Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова») Ларысай Бруевай «Па Машэраўскіх мясцінах Беларусі...».

28 лютага ў сектары ПЦПІ для ўдзельнікаў дзіцячага клуба «Правознайка» прайшоў прававы лікбез «Я – будучы выбаршчык».

28 лютага адбылася сустрэча з актрысай, вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа Ларысай Антосевай «Прастора душы». Мерапрыемства падрыхтавана сумесна з коласаўскім тэатрам.

1–2 сакавіка адбыўся абласны семінар дырэктараў раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк Віцебскай вобласці «Бібліятэчныя сістэмы Віцебскага рэгіёна: стан і перспектывы развіцця ў сучасных умовах». У першы дзень удзельнікі пазнаёміліся з асноўнымі тэндэнцыямі развіцця бібліятэк сеткі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Быў дадзены аналіз дзейнасці бібліятэк Віцебскай вобласці за 2017 год. Прагучалі актуальныя пытанні дзейнасці прафсаюзных арганізацый у сучасных умовах. Адбыўся круглы стол «Экалагічная асвета, выхаванне і адукацыя як аснова фарміравання экалагічнай культуры». У рамках семінара прайшло ўзнагароджанне пераможцаў абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». 2 сакавіка ўдзельнікі семінара з творчым візітам наведалі ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», дзе была арганізавана экскурсія па Лёзненскім культурна-спартыўным цэнтры і цэнтральнай бібліятэцы. Прысутныя пазнаёміліся з асноўнымі накірункамі дзейнасці галіны культуры Лёзненшчыны, абмеркавалі арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва раёна, духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі ва ўмовах сучаснай бібліятэкі. Адбылася прэзентацыя літаратурнай кавярні «Пад абажурам» цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Лёзненская ЦБС».

2 сакавіка для малодшых школьнікаў была арганізавана літаратурная кампазіцыя з элементамі гульні і відэарадам «Маму любяць усе на свеце» і быў праведзены майстар-клас па вырабе віншавальных паштовак да Дня жанчын.

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы было арганізавана народнае каляндарнае свята «А ў нас сёння Каляда!» з удзелам народнага фальклорнага калектыву «Кудзеліца».

23 студзеня ў ЦРБ была праведзена музычна-паэтычная гадзіна «Я куплет допою» (да 80-годдзя У. Высоцкага).

12 лютага ў ЦРБ адбылася прэзентацыя кнігі І. Каранеўскай «Дубровенскі час».

У сакавіку работнікі ЦРБ арганізавалі віртуальную экскурсію «Дубровенщина, что в названиях твоих» і тэматычны вечар «Забвению не подлежит» (да 75-годдзя трагедыі Хатыні).

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы пад назвай «Жалобная кніга прыроды» было праведзена падарожжа па старонках «Чырвонай кнігі Беларусі». **18 студзеня** ў раённай бібліятэцы была арганізавана сустрэча з віцебскай паэтэсай Людмілай Дунец.

12 лютага ў ЦРБ быў праведзены агляд літаратуры да 80-годдзя ўтварэння Віцебскай вобласці «Любі свой край, паважай сваю гісторыю» (у рамках «Бібліяграфічнага ліцэя»).

21 лютага да Міжнароднага дня роднай мовы ў ЦРБ быў арганізаваны вечар «Роднай мовы пералівы» (у рамках клуба «Добрыя сустрэчы»), у дзіцячай бібліятэцы прайшоў урок беларусазнаўства «Які гэта цуд – мова мая родная!».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

16 студзеня ў раённай бібліятэцы адбылася сустрэча з настаяцелем храма Узнясення Гасподняга, іерэем Расціславам Страхой «Вадохрышча. Гісторыя, традыцыі, звычаі». У рамках мерапрыемства быў зроблены агляд духоўнай літаратуры і адбыўся прагляд відэароліка «Вадохрышча».

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

6 студзеня ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы прайшоў вечар знаёмства з беларускімі абрадамі « Ой, калядачкі, калядкі".

30 студзеня для старэйшай групы дзіцячага сада № 1 у чытальнай зале ЦРБ работнікамі аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры быў праведзены ранішнік «Разам з казкай вырастаем». Мерапрыемства прайшло ў рамках праекта «Чытаем па-беларуску». Дзеці з задавальненнем слухалі бібліятэкара, якая расказала пра беларускія казкі, паўдзельнічалі ў віктарыне, пагулялі ў гульні. Скончыўся ранішнік паказам лялечнага спектакля «Разумная ўнучка».

21лютага ў ЦРБ прайшла імпрэза «Шануй родную мову», на якой адбылася размова пра стан беларускай мовы ў сістэме адукацыі і культуры раёна.

23 сакавіка ў ЦРБ адбыўся тэматычны семінар бібліятэчных работнікаў «Бібліятэка ў сістэме эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі». На семінары прысутнічалі бібліятэкары сельскіх бібліятэк, для якіх метадыст аддзела маркетынгу правяла кансультацыю на тэму «Чым можна заняць дзіця ў бібліятэцы». Прайшла гутарка-абмеркаванне новых форм работы ў бібліятэцы і метадаў іх ўкаранення. Затым семінар прадоўжыўся ў Вархоўскай сельскай бібліятэцы, дзе прайшло тэатралізаванае прадстаўленне«Волшебное царство сказок».

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Работнікамі цэнтральнай бібліятэкі была арганізавана прэзентацыя кнігі драматычных твораў ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Фёдара Палачаніна «Ці так жывём?», надрукаванай выдавецтвам «Народная асвета» пры дапамозе гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. (*Витебские вести. – 2018. – 3 февр. – С. 12.*)

3 сакавіка ў сектары замежнай літаратуры адбыўся краязнаўчы лекторый «Рыцарскія маршруты: Англія, Францыя, Іспанія», прымеркаваны да Сусветнага дня пісьменніка. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава «Рыцарства сярэднявечча».

6 сакавіка ў бібліятэцы адбылося тэатралізаванае адкрыццё выставы дзіцячага малюнка «Маме – мой зямны паклон». На выставе прадстаўлены працы вучняў студыі выяўленчай творчасці «Сузор'е» ДУА «Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі».

12 сакавіка ў сектары замежнай літаратуры адкрылася слайд-фотавыстава Ірыны Дзянісавай «#1ЗЮМ: Усё, што павінна расквітнець, расквітнее», прымеркаваная да Года малой радзімы.

13 лютага, напярэдадні Дня праваслаўнай кнігі, у сценах Віцебскай абласной бібліятэкі адбылася прэзентацыя беларускага перакладу «Новага Запавету Госпада нашага Ісуса Хрыста». Праграма святкавання Дня праваслаўнай кнігі ў Віцебскай епархіі вельмі насычаная, але мерапрыемства, якое адбылося ў бібліятэцы, займала цэнтральнае месца ў гэтай праграме.

14 сакавіка ў нямецкай чытальнай зале праходзіла пасяджэнне метадычнага аб'яднання настаўнікаў нямецкай мовы ўстаноў адукацыі Першамайскага раёна г. Віцебска на тэму «Суб'ект-суб'ектныя адносіны як аснова арганізацыі іншамоўных зносін на вучэбных занятках па замежнай мове».

14 сакавіка, у Дзень праваслаўнай кнігі, у бібліятэцы прайшоў асветніцкі лекторый «Невядомая Псалтыр», прысвечаны культурным, гістарычным і духоўным аспектам біблейскай кнігі Старога Запавету. Сустрэча прайшла ў форме тэлемоста паміж Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна і Астраханскай абласной навуковай бібліятэкай.

20 сакавіка адбылося адкрыццё абласной выставы «Юбілейныя сімвалы», прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці. У экспазіцыі прадстаўлены вышытыя гербы і сімвалы ўсіх раёнаў вобласці.

21 сакавіка сектарам замежнай літаратуры была праведзена тэатральная гасцёўня з удзелам аматарскага тэатральнага калектыву «Светоч». Мерапрыемства было прымеркавана да Міжнароднага дня тэатра.

22 сакавіка ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры адбылася сустрэча з прафесарам ветэрынарных навук, загадчыкам кафедры хвароб дробных жывёл і птушак Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны У. А. Герасімчыкам «Хваробы хатніх дробных жывёл і птушак».

22 сакавіка супрацоўнікі нямецкай чытальнай залы правялі традыцыйную велікодную майстэрню «Frohe Ostern» для школьнікаў, які вывучаюць нямецкую мову.

Чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» адбыліся **22 сакавіка**. Тэма – «Віцебск шматнацыянальны ў 1920-я гг.».

26 сакавіка ў аддзеле перыядычных выданняў у рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» прайшла інфармацыйная гадзіна «Кніга стала бліжэй» для людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з Віцебскага Клубнага дома «Крылы надзеі», а таксама адбыўся літаратурна-музычны вечар «Віват, раён любімы наш!», прымеркаваны да Года малой радзімы і прысвечаны Чыгуначнаму раёну г. Віцебска.

27 сакавіка адбылася сустрэча з навучэнцамі групы НС-2 рэжысёрскага курса УА «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў» (выкладчык І. Баярынцаў).

27 сакавіка прайшоў творчы вечар паэтэсы, кандыдата філалагічных навук Алены Крыклівец «Гульня ў класікі». Старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамара

анлайн-сустрэчы ўдзельнічалі бібліятэкары ЦБС г. Пскова і работнікі Барысаўскай ЦРБ імя І. Х. Каладзеева.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

21 лютага ў дзіцячай бібліятэцы прайшоў турнір знаўцаў «Гучная, звонкая матчына мова». Да мерапрыемства была афармлена выстава «Мова родная – наша спадчына і запавет».

22 сакавіка на базе дзіцячай бібліятэкі быў праведзены семінар-практыкум «Информационно-рекламная деятельность детской и школьной библиотек как основа организации работы по приобщению учащихся к чтению».

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

80-годдзю з дня заснавання Віцебскай вобласці былі прысвечаны: кніжная выстава «Край мой Прыдзвінскі» (ЦБ), віртуальныя падарожжы «Віцебская вобласць: вехі гісторыі» (Заронаўская с/б), «Гісторыя майго краю – мая гісторыя» (Тулаўская с/б), мультымедыйная прэзентацыя «Ведай свой край!» (Капцянская с/б), інфармацыйныя гадзіны «Віцебская вобласць: гісторыя, падзеі, факты» (Акцябрская, Бабініцкая с/б), гістарычнае дасье «Шлях даўжынёй у 80 год» (Шапуроўская с/б).

14 лютага, напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, у ЦРБ была праведзена патрыятычная гадзіна «Час выбраў нас», у час якой адбылася сустрэча з удзельнікам лакальнага канфлікту ў Нагорным Карабаху Віктарам Пахомчыкам, выканаўцам патрыятычных песень, лаўрэатам Міжнародных фестываляў і конкурсаў.

ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

16 студзеня ў Аршанскай цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адкрылася кафедра праваслаўнай літаратуры – другая ў Віцебскай епархіі. Ва ўрачыстасці прыняла ўдзел дэлегацыя са Смаленшчыны: духавенства, педагогі, урачы, бібліятэкары і оперны спявак з Рудні С. Часновіч. (*Аршанская газета. – 2018. – 20 студз. – С. 6.*)

«Дорогами православия» – пад такой назвай прайшоў фестываль праваслаўнай кнігі, прысвечаны святым беларускай зямлі і праведзены ў цэнтральнай бібліятэцы.

ДУК «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

21 лютага ў чытальнай зале ЦРБ адбылася прэзентацыя выставы тканых і вышываных рэчаў «Уратаваныя скарбы». Кожная з прадстаўленых работ, а некаторым з іх ужо больш за 100 гадоў, сагрэта цяплом малой радзімы і захоўвае таямніцы культурнай спадчыны і памяць беларускага народа.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

15–24 студзеня ў бібліятэках ЦБС праходзіла бібліятэчная краязнаўчая эстафета «Беларускае! Роднае! Сваё!», прысвечаная 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці.

24 лютага ў ЦРБ у рамках творча-інавацыйнага праекта «Пашыраем прафесійныя гарызонты» быў праведзены «круглы стол» на тэму «Публічныя бібліятэкі Браслаўскага раёна: арыентыры на эфектыўнасць».

26 лютага бібліятэкары цэнтральнай і дзіцячай бібліятэк прынялі ўдзел у міжнародным вебінары «Праектная дзейнасць як аснова развіцця творчага патэнцыялу бібліятэк». Загадчык аддзела маркетынгу І. Макарэвіч прадставіла даклад аб рэалізацыі праекта «Вольная вулічная бібліятэка». У

Краснова-Гусачэнка ўручыла А. Крыклівец Дыплом Саюза пісьменнікаў Беларусі.

28 сакавіка ў бібліятэцы ў рамках цыкла мерапрыемстваў «Да 80-годдзя з часу ўтварэння Віцебскай вобласці» адбылася сустрэча з краязнаўцам, лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі, лаўрэатам звання «Чалавек года Віцебшчыны–2017» Аркадзем Падліпскім. У рамках сустрэчы прайшла прэзентацыя серыі выданняў «Біяграфія віцебскага дома».

29 сакавіка ў бібліятэцы былі праведзены пазачарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Віцебск у XVIII ст.: гісторыя і гісторыкі». З лекцыяй выступіў кандыдат гістарычных навук, даследчык старажытных тэкстаў Максім Макараў.

29 сакавіка ў бібліятэцы адбылося адкрыццё выставы фатаграфіі і графікі Тадэвуша Урбеля, а таксама прэзентацыя кнігі «Калейдаскоп. Сардэчна запрашаю ў мой свет...». Мерапрыемства прысвечана Сусветнаму дню распаўсюджвання інфармацыі аб праблеме аўтызму.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

17 студзеня ў бібліятэцы імя Я. Купалы было арганізавана краязнаўчае падарожжа, якое правёў краязнаўца Мікалай Півавар для навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-педагагічнага каледжа.

З нагоды святкавання 80-годдзя Віцебскай вобласці бібліятэка імя У. Караткевіча **22 студзеня** запрасіла сваіх наведвальнікаў прыняць удзел у квэст-гульні "Скарбы Віцебскай зямлі".

Святочная вечарына «Армія нашай краіны», якая адбылася **23 студзеня** ў ЦГБ імя М. Горкага, адкрыла цыкл мерапрыемстваў у бібліятэках горада, прысвечаных 100-годдзю Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

2 лютага ў ЦГБ імя М. Горкага стартаваў літаратурна-адукацыйны праект «Многоточие». Аўтар праекта – філолаг і паэтэса Алена Крыклівец. Праграма «Признания старого сказочника» была прысвечана К. Чукоўскаму.

24 лютага ў ЦГБ імя М. Горкага была арганізавана сустрэча-дыялог «З легендаў і казак» да Міжнароднага дня роднай мовы. На сустрэчу са старшакласнікамі прыйшлі мастак Святлана Баранкоўская і кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі тэатра імя Я. Коласа Алесь Замкоўскі.

9 сакавіка ў бібліятэцы ім. Е. Полацкай прайшоў творчы вечар «Исповедь души» віцебскага паэта і барда Алега Іванова.

У ЦГБ імя М. Горкага **13 сакавіка** адбыўся творчы юбілейны вечар паэта, празаіка, парадыста Уладзіміра Міхайлавіча Ермаковіча, прымеркаваны да яго 80-годдзя.

Навучэнцы УА «Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж лёгкай прамысловасці» сталі ўдзельнікамі літаратурнага свята «Віцебскі дзень У. Маякоўскага», якое адбылося **26 сакавіка** ў бібліятэцы імя У. Маякоўскага.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

25 студзеня ў бібліятэцы імя К. Сіманава адбылося адкрыццё бібліятэрапеўтычнага клуба «Оранжевое настроение». Гэта сумесны праект бібліятэкі і аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра.

У бібліятэцы імя Я. Коласа стартаваў святочны інформ-рэліз «60 – узнай о своем городе больше», прысвечаны 60-гадоваму юбілею Наваполацка.

Да 70-гадовага юбілею пісьменніка і журналіста Навума Гальпяровіча ў бібліятэцы імя У. Караткевіча быў праведзены марафон літаратурных чытанняў «Там, дзе небам мне было дадзена…».

Новы сацыяльны праект «Сямейная субота ў бібліятэцы» стартаваў **27 студзеня** ў ЦБ імя У. Маякоўскага.

Працягваў сваю работу праект «Чытай са мной па-беларуску». **11** і **29 студзеня** бібліятэкары дзіцячай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна разам з маладымі супрацоўнікамі ЦБС наведаліся ў дзіцячую паліклініку, каб дзеці і іх бацькі мелі магчымасць стаць ўдзельнікамі зімовай гульнёвай праграмы «Зімовыя замалёўкі».

5 лютага ў дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака і ў ЦБ імя У. Маякоўскага адбыліся сустрэчы з вядомым беларускім пісьменнікам, заслужаным журналістам Беларусі, Ганаровым грамадзянінам Полацка і Наваполацка Н. Я. Гальпяровічам.

10 лютага ў ЦБ імя У. Маякоўскага ў рамках праекта «Літаратурныя сустрэчы ў культурнай сталіцы» адбылася творчая сустрэча з віцебскімі паэтамі Аленай Крыклівец і Алегам Сяшко.

20 лютага Наваполацк наведаў вядомы беларускі пісьменнік Міхась Пазнякоў. Сустрэчы адбыліся ў дзіцячых бібліятэках імя А. Пушкіна, С. Маршака і ў ЦБ імя У. Маякоўскага.

100-годдзю з дня нараджэння П. М. Машэрава былі прысвечаны: рэтра-фотавыстава «Пётр Машеров: Жизнь.Судьба. Память» (ЦБ імя У. Маякоўскага), выстава «Пётр Машэраў. Жыццё. Лёс. Памяць» (бібліятэка імя У. Караткевіча), гістарычнае дасье «Верный сын белорусского народа» (дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна), гадзіна патрыятычнага выхавання (дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака).

У рамках рэспубліканскай акцыі «Наваполацк – культурная сталіца Беларусі 2018 года» **20 сакавіка** бібліятэкі сістэмы наведалі беларускі паэт Л. Дранько-Майсюк і паэт-бард Э. Акулін. Сустрэчы з імі адбыліся ў ЦБ імя У. Маякоўскага і ў дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака. Паэты прадставілі свае новыя зборнікі і часопіс «Верасень».

Традыцыйны Дзень праваслаўнай кнігі ў ЦБ імя У. Маякоўскага быў прысвечаны тэме «Фрески XII века Спасо-Преображенского храма в Полоцке – открытая книга, переданная нам Преподобной Евфросинией Полоцкой».